З першых вуснаў

# «МЫ АБСАЛЮТНА АДКРЫТЫЯ ДА ПРАДМЕТНАЙ РАЗМОВЫ ПА ЎСІХ НАПРАМКАХ СУПРАЦОЎНІЦТВА»

## Аляксандр Лукашэнка правёў рабочую сустрэчу з губернатарам Томскай вобласці Уладзімірам Мазурам

**Сібіры ў беларуска-расійскім супрацоўніцтве на рэгіянальным узроўні адводзіцца вялікае значэнне. Гэты вялікі, найбагацейшы край па праве называюць скарбніцай не толькі Расіі, але і свету. Значны рэсурсны, прамысловы, турыстычны, а таксама інтэлектуальны патэнцыял рэгіёна ўяўляе каласальную цікавасць і для нас. Невыпадкова Томская вобласць з'яўляецца для Беларусі адным з перспектыўных сібірскіх партнёраў. Сведчанне гэтаму — імклівы рост тавараабароту. За першае паўгоддзе аб'ём узаемнага гандлю павялічыўся тройчы ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Аднак гэта не нагода запавольваць тэмп. Наадварот, самы час абмеркаваць новыя кірункі дзейнасці ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва.**

### «ВАЖНА, ШТО МЫ СЫХОДЗІМ АД ЗНЕШНЯЙ ЗАЛЕЖНАСЦІ»

Як адзначыў Прэзідэнт, у мінулым годзе аб'ём гандлю паміж Беларуссю і Томскай вобласцю вырас амаль на 50 % і склаў без малога 23 мільёны долараў. «Станоўчая дынаміка назіраецца і сёлета, — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы. — За першае паўгоддзе рост — амаль 30 %. Але абсалютна відавочна, што гэта вельмі мала для такіх магутных у прамысловых, сельскагаспадарчых адносінах краёў. Тавараабарот можа і павінен быць як мінімум у два-тры разы большы».

Пунктаў росту для сумеснага развіцця, па меркаванні беларускага лідара, звышдастаткова. «Адной з традыцыйных асноў нашага эканамічнага супрацоўніцтва з'яўляецца экспарт у ваш рэгіён сельскагаспадарчай сыравіны, — нагадаў Аляксандр Лукашэнка. — І не толькі соладу».

У 2022 годзе ў Томскую вобласць пачаліся пастаўкі амінакіслот Беларускай нацыянальнай біятэхналагічнай карпарацыяй. «Гэты прадукт, вы ведаеце, жыццёва неабходны ў жывёлагадоўлі, — удакладніў кіраўнік дзяржавы. — І з улікам рознага кшталту ціску на нас і санкцый Захаду вельмі важна, што і тут мы сыходзім ад знешняй залежнасці».

Прэзідэнту дакладваюць, што для Томска і вобласці ў цэлым актуальным з'яўляецца пытанне мадэрнізацыі гарадскога электрычнага транспарту. «Ведаю, што ў вас шырока эксплуатуюцца беларускія тралейбусы, — заўважыў кіраўнік дзяржавы. — Мы гатовы забяспечыць усёй лінейкай патрэбнай тэхнікі, у тым ліку трамваямі, аўтобусамі і электробусамі».

Беларускі бок (прадпрыемства «Магілёўліфтмаш») можа цалкам задаволіць патрэбу рэгіёна і ў ліфтавым абсталяванні — як для новабудоўляў, так і ў рамках праграм замены ліфтаў.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што за апошнія гады Томская вобласць дабілася важкіх поспехаў у аграрным сектары. «Мы ўносім свой сціплы ўклад у гэты працэс, — удакладніў ён, маючы на ўвазе беларускую сельскагаспадарчую тэхніку, перш за ўсё трактары і камбайны. — Мяркуем, што наш вопыт і якасныя тэхналогіі таксама маглі б быць запатрабаванымі ў жывёлагадоўлі, раслінаводстве, а таксама будаўніцтве малочнатаварных фермаў і зернесушыльных комплексаў. Мы гатовы падзяліцца тэхналогіямі апрацоўкі і перапрацоўкі лёну-даўгунцу. Ваш край, як і ўся Беларусь, з'яўляецца ў гэтым плане флагманам».

Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што больш за 60 % тэрыторыі Томскай вобласці занята лясамі. Таксама ў рэгіёне — каласальныя запасы торфу. Гэта багацце, як перакананы беларускі лідар, трэба не толькі эфектыўна выкарыстоўваць, але і сумець зберагчы: асабліва ад пажараў, якія пачасціліся ў апошнія гады. У гэтай сувязі Беларусь гатова падзяліцца напрацоўкамі ў вытворчасці лесанарыхтоўчай, пажарнай, аварыйна-ратавальнай тэхнікі, машын для здабычы торфу.

### «МЫ ПАВІННЫ РАЗУМНА І РАЦЫЯНАЛЬНА ВЫКАРЫСТОЎВАЦЬ ВЫСОКІЯ КАМПЕТЭНЦЫІ АДЗІН АДНАГО»

Аляксандр Лукашэнка лічыць правільным, што асаблівая роля ў сацыяльна-эканамічным развіцці расійскага рэгіёна адводзіцца навукова-адукацыйнай сферы. «Сёння Томская вобласць уваходзіць у тройку лідараў нацыянальнага навукова-тэхналагічнага рэйтынгу Расіі, а горад Томск называюць студэнцкай сталіцай, — канкрэтызаваў Прэзідэнт. — Безумоўна, якаснае навучанне моладзі і падрыхтоўка навуковых кадраў — гэта залог паспяховай будучыні любой краіны».

Кіраўнік дзяржавы паведаміў, што паміж установамі адукацыі Беларусі і Томскай вобласці дзейнічаюць 25 дагавораў аб супрацоўніцтве, выконваецца шэраг сумесных навукова-даследчых праектаў. Аднак, па меркаванні беларускага лідара, патэнцыял узаемадзеяння ў адукацыі і навуцы паміж нашай краінай і гэтым расійскім рэгіёнам далёка не раскрыты. «Мы павінны разумна і рацыянальна выкарыстоўваць высокія кампетэнцыі адзін аднаго», — перакана80 Аляксандр Лукашэнка.

Добрым прыкладам такой інтэлектуальнай кааперацыі, на думку кіраўніка дзяржавы, можа стаць рэалізацыя расійскімі вучонымі сумесна з Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі і кампаніямі праекта па вытворчасці транзістараў для аэракасмічнага і спецыяльнага прызначэння, што цяпер вельмі актуальна. Прэзідэнт упэўнены, што разам нам пад сілу ствараць самыя перадавыя тэхналогіі, ліквідуючы залежнасць Расіі і Беларусі ад Захаду.

«Мы абсалютна адкрытыя да прадметнай размовы па ўсіх напрамках супрацоўніцтва, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Вы можаце быць абсалютна ўпэўнены: калі мы паабяцаем нешта і дамовімся аб чымсьці, беларусы абавязкова гэта выканаюць. Я запэўніваю вас, што нашы дамоўленасці будуць выкананы на сто і нават больш, чым на сто, працэнтаў».

Напрыканцы сустрэчы кіраўнік дзяржавы выказаў удзячнасць губернатару Томскай вобласці і яго калегам, што яны знайшлі час і прыехалі ў Беларусь, каб паглядзець, як яна развіваецца, пераняць вопыт і перадаць свой каштоўны досвед дзеля развіцця нашай агульнай Айчыны — ад Брэста да Уладзівастока.

**Вераніка КАНЮТА.**

### У тэму

#### «Павелічэнне тавараабароту — задача амбіцыйная, але вырашальная»

У размове з журналістамі **губернатар Томскай вобласці Уладзімір МАЗУР** адзначыў, што сёння шмат кірункаў, якія звязваюць беларускі і расійскі народы як эканамічна, так і культурна. «Калі мы возьмем аграрны сектар, то тут, пачынаючы ад тэхнікі, яе набыцця, пастаўкі камплектуючых да тэхнікі з Беларусі ў часткі радыёэлектронікі і заканчваючы селекцыяй, — гэта новыя віды сартоў гародніны і збожжавых, — канкрэтызаваў асноўныя напрамкі ўзаемадзеяння Беларусі з Томскай вобласцю яе кіраўнік. — Калі кажам аб навуцы, то прапанова Акадэміі навук Беларусі ад нашага навукова-адукацыйнага комплексу, дзе мы маем агульныя кампетэнцыі і напрацоўкі, — абмен меркаваннямі, тымі прапановамі, якія мы сфармулявалі для сучаснага развіцця эканомікі». У сваю чаргу, як падкрэсліў губернатар, томскім вучоным таксама ёсць што запазычыць у беларускіх калег.

Кажучы аб супрацоўніцтве ў культурнай сферы, Уладзімір Мазур падкрэсліў, што ў нас агульная гісторыя. «Нашы народы заўсёды неслі гэту традыцыйную культуру і захоўвалі», — звярнуў увагу ён, удакладніўшы, што канкрэтныя прапановы дэлегацыя ўжо вязе дамоў.

«Беларусь захавала за гэтыя гады навуку, а менавіта развіццё і высокатэхналагічныя падыходы да тых ці іншых прамысловых кірункаў, як і Расія, — звярнуў увагу Уладзімір Мазур. — Дзесьці кампетэнцый больш у Беларусі, дзесьці — у Расіі. Сёння казаць ужо лепш не аб імпартазамяшчэнні, а аб імпартаапярэджанні або незалежнасці ад імпарту. Мы маем усё для таго, каб ісці наперад і быць канкурэнтнымі з сусветнымі стандартамі, у сферы высокіх тэхналогій».

Павелічэнне тавараабароту паміж Томскай вобласцю і нашай краінай — задача, па словах кіраўніка рэгіёна, амбіцыйная, але вырашальная. «У сілу праведзеных сустрэч у Гродзенскай вобласці, цяпер у Мінску мы бачым, што гэтая задача выканальная», — падкрэсліў ён.

14 жніўня ў рамках паездкі на Гродзеншчыну Уладзіміра Мазура прыняў старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Каранік. Праведзена 4-е пасяджэнне працоўнай групы па супрацоўніцтве паміж Рэспублікай Беларусь і Томскай вобласцю Расійскай Федэрацыі. Расійская дэлегацыя наведала агратурыстычны комплекс «Гарадзенскі маёнтак «Каробчыцы», Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы, прадпрыемствы «Спецаўтагаспадарка» і «Гроднаводаканал».

Пасля сустрэчы з Прэзідэнтам Беларусі адбыліся перагаворы губернатара Томскай вобласці з намеснікам прэм'ер-міністра Пятром Пархомчыкам. Завяршыўся візіт расійскай дэлегацыі ў Беларусь наведваннем Інстытута фізікі імя Б. І. Сцяпанава НАН Беларусі і ААТ «Планар».

Міжнародны вектар

# ДЫЯЛОГ ДЗЕЛЯ ЗАХАВАННЯ МІРУ

## Наша слова на XI Маскоўскай канферэнцыі па міжнароднай бяспецы

**З моманту свайго заснавання ў 2012 годзе форум стаў запатрабаванай пляцоўкай адкрытага абмеркавання найбольш актуальных праблем глабальнай і рэгіянальнай бяспекі. Сёлета канферэнцыя праводзілася ва ўмовах кардынальнай змены ваенна-палітычнага становішча ў свеце, станаўлення і ўмацавання рэальнага шматпалярнага светаўладкавання. Кіраўнікі і прадстаўнікі абаронных ведамстваў, міжнародных арганізацый, экспертнай і паліталагічнай супольнасцяў абмяняліся думкамі па ўмацаванні канструктыўнага ўзаемадзеяння ў новых рэаліях.**

### «Беларусь прыкладае максімум намаганняў у барацьбе з выклікамі і пагрозамі»

Прывітанне ўдзельнікам канферэнцыі накіраваў Прэзідэнт Беларусі. «За мінулае дзесяцігоддзе такія сустрэчы і зносіны ў фармаце шматбаковага дыялогу па прыярытэтных напрамках забеспячэння глабальнай і рэгіянальнай бяспекі сталі вельмі запатрабаванымі і актуальнымі, — перакананы Аляксандр Лукашэнка. — Яны даюць магчымасць абмяняцца прафесійнымі меркаваннямі, комплексна ацаніць дынаміку ва ўсіх рэгіёнах зямнога шара, зверыць парадак дня па ключавых праблемах захавання міру».

Беларускі лідар звярнуў увагу на тое, што бягучая міжнародная абстаноўка застаецца беспрэцэдэнтна напружанай. «Абвастрыліся практычна ўсе вядомыя выклікі і пагрозы, — адзначыў ён. — Дыскрэдытавана міжнароднае права ў сферы кантролю над узбраеннямі. Нарастаюць рызыкі прымянення зброі масавага знішчэння, уключаючы правакацыі з выкарыстаннем ядзерных і біялагічных сродкаў паражэння».

Кіраўнік дзяржавы канстатаваў, што інфармацыйныя войны, кіберзлачынствы сталі магутным фактарам эканамічнай і нацыянальнай нестабільнасці для ўсіх без выключэння дзяржаў. Сёння, па яго словах, новым відам зброі, якая падрывае сістэму міжнародных гандлёва-эканамічных сувязяў, выступаюць розныя абмежавальныя меры і санкцыі, якія з інструмента прымусу да міру і бяспекі ператвараюцца ў комплексную пагрозу глабальнага маштабу.

«На гэтым фоне, застаючыся паслядоўным прыхільнікам забеспячэння міру і бяспекі, выконваючы раней узятыя на сябе міжнародныя абавязацельствы, Рэспубліка Беларусь разам з партнёрамі, а таксама ў рамках Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі прыкладае максімум намаганняў для ўмацавання ўзаемадзеяння ў барацьбе з транснацыянальнымі выклікамі і пагрозамі рознага характару, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Размяшчаючы тактычную ядзерную зброю на беларускай тэрыторыі, мы адэкватна рэагуем на паскораную мілітарызацыю Усходняй Еўропы і рост ваеннай актыўнасці ЗША і НАТА. Разам з тым гэта не адмяняе мірныя ініцыятывы, якія выпучаюцца беларускім бокам у інтарэсах перазапуску дыялогу па пытаннях еўрапейскай і глабальнай бяспекі на роўных умовах на карысць усёй планеты — нашага агульнага дома».

Звяртаючыся да ўдзельнікаў канферэнцыі, Прэзідэнт выказаў упэўненасць, што чарговая сустрэча ў Маскве паслужыць цеснаму ўмацаванню супрацоўніцтва паміж дзяржавамі і народамі, стане значным этапам на шляху пабудовы новай сістэмы міжнароднай бяспекі.

### «Асобныя заходнія палітыкі працягваюць штурхаць свет у прорву»

Падчас выступлення на XI Маскоўскай канферэнцыі па міжнароднай бяспецы міністр абароны Беларусі Віктар Хрэнін заўважыў, што многія краіны ўключыліся ў барацьбу з Захадам, адстойваючы сваю незалежнасць і суверэнітэт. «Сёння гэтая барацьба вылілася ў глабальнае супрацьстаянне паміж Захадам і Усходам на тэрыторыі Украіны, — удакладніў ён. — Пры гэтым проксі-вайна, якая разгарнулася там, фактычна паставіла планету на мяжу трэцяй сусветнай вайны».

Кіраўнік беларускага ваеннага ведамства перакананы, што асобныя заходнія палітыкі сваімі дзеяннямі працягваюць штурхаць свет у прорву. «Яны па-ранейшаму думаюць катэгорыямі «метраполій» і «калоній», фактычна адраджаючы гандаль рабамі ў новай форме, — заявіў ён. — Для гэтых сучасных неакаланізатараў уласныя грамадзяне сталі новацца жывым таварам. Мы назіраем, як большасць падкантрольных Вашынгтону кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў паводзяць сябе падобна сярэднявечным гандлярам рабамі, прапаноўваючы за грошы кінуць народы сваіх краін у мясарубку вайны».

У тым, што еўрапейскія ўладныя эліты арыентаваны менавіта на глабальную вайну з Усходам, па словах Віктара Хрэніна, сумнявацца не даводзіцца. «Паказальная ў гэтым плане рыторыка ўдзельнікаў ліпеньскага саміту НАТА ў Вільні, — канкрэтызаваў міністр абароны. — Нягледзячы на тое што шматлікія эксперты завуць яго мыльнай бурбалкай у плане чаканых лёсавызначальных рашэнняў, утоены падтэкст заяў, якія на ім гучалі, відавочна знакавы. Вынікі саміту прыадкрываюць планы альянсу на развіццё сітуацыі ў свеце ў найбліжэйшай перспектыве».

**Паводле прэс-службаў Прэзідэнта і Мінабароны.**